1. Эвакуацыя Менску 28 чэрвеня 1944

2. Пачаткі батальёнаў БКА.

3. Канцэнтрацыя іншых нац. арг. Эльбінгу.
30-я дывізыя Зігліга. 13. батальён у Аугустове.

4. Дыв. Зігліга на западны фронт.

5. Б.Ц.Р. у Бэрліне, Ліхтэнштрас.

6. Развал 30-й дывізыі.

7. Гэн Езавітаў. арганізацыя на Ліхтэнштрасэ.

8. Дывізыя „Беларусь" палкоўнік Шувалаў.

9. Прапаганда на карысьць ген. Власава.

10. Канфлікт Астроўскі - Езавітаў.

11. Развал дывізыі „Беларусь"

12. Аднаўленьне дывізыі Беларусь

13. Марш дыв. Беларусь у Тырольскія горы.

14. Лучнасьць із ген. Мальцавым.

15. пераход дыв. Беларусь да Амэрыканцаў.

vytoki.net

Маю гонар прывітаць усіх, што сабраліся тут для аддання чэсьці памяці ўсім беларусам, якія аддалі сваё жыцьцё ў змаганьні за незалежнасьць Бацькаўшчыны Беларусі незалежна ад часу і месца [а такіх у нас ёсьць сотні тысяч, растрэляных у склепах НКВД, замучаных у сталінскіх лагерах і паўшых на палёх бітваў у збройным змаганьні із ворагамі законнікаў Беларусі.] Паўстаньняў на Беларусі супраць бальшавіцкіх панявольнікаў у нас было шмат, як у Віцебшчыне, Магілёўшчыне, Гомельшчыне і паўстаньне слуцкае, якое распачалася 27-га лістапада 1920-га года. Дзень 27-га лістапада выбраны ў беларусаў як дзень беларускіх герояў і кожны год адзначаецца, як жалобнае сьвята у якім кожны беларускі патрыёт думкамі лучыцца з тымі нашымі мучанікамі, што аддалі сваё жыцьцё за Бацькаўшчыну - Беларусь. [Гадавіна слуцкага паўстаньня, як дзень герояў] зьяўляецца таму, ~~што~~ што слуцкія паўстанцы найясней пастановілі мэту змаганьня за незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі, сьведама пастанавілі афяраваць сваё жыцьцё за свабоду Бацькаўшчыны. На іхнім сьцягу, што афяравалі ім беларускія жанчыны было напісана „Тым што пайшлі ўміраць каб жыла Бацькаўшчына“ не перамагаць, а ўміраць, што гэтым словам „ўміраць“ б[illegible] з горы наканаваньня на сьмерць

vytoki.net

у гэтым вялікай ахвяры, таму іхні чын
стаўся сымвалам усіх збройных змаганьняў
беларускіх за свабоду Беларусі.

Кожнае збройнае змаганьне, ці то вайна
між дзяржавамі, ці паўстаньне якога небудзь
народу, можа лічыць на посьпех, калі будзе
мець наступныя варункі: 1. людзкія рэзэрвы
для папаўненьне фронту, 2. матэрыяльнае
забясьпячэньне і 3. абшар для манэўру. [Слуц-
кія паўстанцы нічога гэтага ня мелі, міма
гэтага яны змагаліся шэсьць тыдняў із чыр-
вонай арміяй, якая мела усё што толькі
патрэба для вядзеньня вайны. Абясьняецца
гэта толькі тым што былі яны беларускімі
патрыётамі гатовымі на усякія ахвяры.
Вычэрпаўшыся да астатка над усімі пашыда-
мі у бязупынных баях і ня маючы абшару
для манэўру, мусілі яны адступіць за раку
Лань за якой знаходзілася польская акупацый-
ная армія, якая іх разброіла і зачыніла у
лагер ваенна-палонных. Можа быць некатары
навят тут прысутным прыходзіць на думку на-
што тады трэба было паднімаць паўстаньне,
калі ня было надзеі на перамогу. На гэта мо-
жа быць толькі адзін адказ. Паўстаньне было
неабходнае, як дэманстрацыя перад усім сьветам,

vytoki.net

што існуе на сьвеце беларускі народ, што ён мае права жыць, што ён змагаецца за сваё жыцьцё, што ён мае права на жыцьцё незалежнае ад сваіх суседзяў. У гэным часе адбывалася у Парыжы Вэрсальская Конфэрэнцыя на якой вялікія дзяржавы, як Амэрыка, Францыя і Англія, пасьля капітуляцыі Нямеччына дзялілі сьвет так як яны хацелі. На гэнай канфэрэнцыі была дэлегацыя ад БНР. Яна дамагалася ад канфэрэнцыі прызнаць Беларусь як незалежную дзяржаву. Трэба было паказаць перад сьветам сваё змаганьне за незалежнасьць, а паказаць можна было толькі зброеным змаганьнем і Слуцкае паўстаньне з гонарам гэтае заданьне выканала. Праўда незалежнасьці Беларусі гэная канфэрэнцыя не прызнала, але беларускае пытаньня паўстаўлена было ~~пастаўлена~~ перад сьветам як справа якая павінна быць развязаная. Часьцёва яна была развязаная у другую сусветную вайну як БССР із правам афіцыйнага прадстаўніцтва у Задзіночаных Нацыях. Але гэтым Беларускае пытаньне не ~~развязана~~ выраашана. Беларускі народ ніколі з гэтым не памірыцца і будзе весьці змаганьне далей аж Беларусь атрымае поўную дзяржаўную незалежнасьць.

Лакэдэмон. Мільтія.

Падарожны занясі вестку усім грамадзянам Лакэдэмона, што мы чэсна выканалі свой абавязак ляжым у магіле.

vytoki.net

Эвакуацыя Мянску 28-га чэрвеня 1944 году. 2-і беларускі кангрэс. Б.Ц.Р. штаб Б.К.А. Няма загаду із Нямецкага штаба. Мая гутарка із начальнікам штаба генерала Годберга. эвакуацыя Б.Ц.Р. і штабу Б.К.А. у Кэнігсбэрг чыгуначным транспартам. выезд із Менску ген. Годбэрга і прэзыдэнта Астроўскага. Абарона чыгуначнага транспарту прэдстаўнікам С.Д. Сэпан. Шуканьня кантактаў із штабам ген. Годбэрга. Прыезд Б.Ц.Р. і штабу Б.К.А. у Кэнігсбэрг. бэз прэзыдэнта Б.Ц.Р. Астроўскага.

мой выезд на фронт для пошукаў батальёнаў Б.К.А. сустрэча із афіцэрскай школай у Плоцку.

Канцэнтрацыя усіх іншанацыянальных вайсковых адзінак, якія адступалі арганізована накіроўвалі у невялікі горад у Прусіі Эльбінг Бел.Афіцэрская школа накіравана была у Эльбінг. Арганізацыя із усіх іншанацыянальных адзінак адной дывізыі із нумарам 30-тым пад камандай Палкоўніка Зігліна, як расейская дывізыя. Трагэдыя Мікулы. Бел. афіцэрская школа была пераназваная на 20-тую роту із камандзірам расейцам і шэфам роты фолькс-дойчам. Капітан Мікула быў назначаны камандзірам звязу у расейскай роце. Аб усей гэтай падзеі нічога ня ведала ані Б.Ц.Р., ані штаб Б.К.А.

Бэрлін

У канцы ліпеня 1944 году Б.Ц.Р. і штаб Б.К.А. былі перанесеныя із Кенігсбэрга у Бэрлін. Тут

vytoki.net

былі заквартэраваныя у вельмі добрых будынках пад назовам Вайсэнзее. У гэтым часе пачалі прыбываць у Бэрлін вельмі шмат людзей. Былі гэта вайскоўцы адсталыя ад сваіх батальёнаў і шмат цывільных людзей, якія уцякалі ад бальшавіцкай арміі. Усе яны звярталіся у БЦР з просьбай аб дапамозе. Я звярнуўся да камэндантуры Бэрліна з запатрабаваньнем вызначыць для штабу БКА памяшканьне у якім можна было бы заквартэраваць беларускіх фраўнэраў прыбываючых з фронта. Камэндантура вызначыла школьны будынак на Ліхтэнштрасэ. Такім чынам вуліца <u>Ліхтэнштрасе</u> сталася другім зборным пунктам для беларускіх фраўнэраў і іншых беларусаў пад відам фраўнэраў. Тут атрымоўвалі дах над галавой і харчовыя карткі. Праз ~~..~~ які небудзь месяц сабралася тут некалькі сот фраўнэраў у тым некалькі дзесяткаў афіцэраў. Зборка 13-тага батальёну у Аўгустове. Бунт роты падлейтэнанта Бандыка супроць немцаў і адыход у лес. Выдаленьне із батальёну усіх беларускіх афіцэраў, якія прыбылі у Бэрлін. Расстрэл двух афіцэраў Махорта і Фразда. Стральцы накіраваныя у 30-тую дывізыю.

Прыбыцьцё у БЦР генэрала Езавітава. Астроўскі вызначыў Езавіта на вайсковага міністра. Я прыняў усю справу часьці. Падпарадкаваньня БЦР і штабу С.С. Гаўптамту у Берліне.

vytoki.net

Мабілізацыя Езавітовавым беларусаў із остарбайтораў у беларускае войска і прыезд да Ліхтэнштрасэ.

Арганізацыя выкшталеньня жаўнераў на Ліхтэнштрасэ.

У першай палове жніўня 1944 года 30-я дывізія была адпраўляная на заходні фронт у Францыю. Масавыя пераходы жаўнераў да французкіх партызанаў так званых макісаў.

Адвод дывізіі ад фронту. Кары, як расстрэлы, адсыланьня на цяжкія работы і канцэнтрацыйны лагеры. Згуба капітона Мікулы. У Дахаў

Зіглінг у пачатку снежня із невялікай групай недабіткаў перованна афіцэраў і падафіцэраў пераехаў у Гіршау дзеля арганізацыі новай дывізыі.

Прыезд Зіглінга у Бэрлін. Нарады Астроўскага, Езавітова і Зіглінга.

Агляд Зіглінгам жаўнераў Дывізыя „Беларусь" у снежні 1944 году. У студзені 1945 г. на Ліхтэнштрасэ. Маёр Гэнэрэлд заладзіваў на чыгунач[н]ым прыпынку у Бэрлін транспарт усіх маладых афіцэраў і жаўнераў і павёз у Гіршау у дывізыю „Беларусь". Як лучнік дывізыі Беларусь із Б.Ц.Р. быў вызначаны маёр Рагуля Барыс.

Нямецкія вайсковыя ўлады выдалі распараджэньне аб абяднаньні усіх славянскіх вайсковых арганізацыяў пад камандай гэнэрала Уласава. Расейскі і нямецкі націск на Б.Ц.Р. да абяднаньня із Р.А.А.

vytoki.net

сеяях
стотканцы Б.Ц.Р. адышлі Будзіловіч, качанскі, Кідаль і Дудзіцкі.
Канфлікт Астроўскага і Езавітава. Палкоўнік Шувалаў. Ад'езд Езавітава у бальніцу д-ра Шчорса. Езавітава захапіла савецкая армія. Канфлікт Зігіньга із Барысам Рагулям. Стараньня Астроўскага перад Гаўптманам аб адкамандзіраваньні мяне у дывізыю Беларусь Адмова. Я на сабскую адказнасьць паехаў у дывізыю „Беларусь" пад відам вярбаўніка ахвотнікаў у дывізыю Беларусь.
Мой прыезд у дывізыю. Зігіньг спаткаў мяне з радасьцяй. Поўны развал дывізыі Бел. Прычынай было благія адносіны да шараговых. Хадзілі чуткі, што гэтая дывізыя будзе ужыта да каханьня акопаў, што жаўнерам не падабалася. Пачалася дэзэрцыя. Зігіньг прасіў мяне каб я ужыў[на] жаўнераў. Каб спынілася дэзэрцыя. і іншае. Пераход дывізыі із Гірішу у Ваерзэя. Зігіньг адыходзіў на арганізацыю Новай нямецкай дывізыі. Небэлонгі. Камандзірам дывізыі быў вызначаны маёр Тэнэрэнд стары рэзэрвіст. Я дубляваны камандзір дывізыі. Жная прапаганда аб захаваньні дывізыі у цэласьці ад да канца вайны. Гутаркі із афіцэрамі і падафіцэрамі. Адабраньня зброі і мэнагак ад наших жаўнераў для дывізыі ~~[illegible]~~ „Небэлонгі"
ушыт[illegible]ньне дысцыпліны. Вайсковыя заняткі.

vytoki.net

Ідэя Гітлера аб канцэнтрацыі войск СС у тырольскіх гарах. 15 красавіка дывізыя атрымала загад маршыраваць на паўдня у кірунку Пасау. Палкоўнік Шувалаў у дывізыі. Маёр Гэннэрэнд з дывізыяй не маршыраваў. Палкоўнік Шувалаў астаўся у „выглядах". Я камандзір дывізыі „Беларусь". Асягненьня дывізыяй Айзэнштатфорсф.

Навязаньня кантакту і ген. Мальцовым. Афіцэраў нямецкіх для сувязі з мусіў пакінуць дывізыю. Акупацыйная зона дывізыі Беларусь. Пагроза нападу войск СС із Айзэнштайн Маркт. Меры абароны. Афіцэры спаролі нямецкія адзнакі і нашывалі беларускія.

Сход афіцэраў беларускіх і дывізыі Мальцава. Пераход дывізыяй праз нямецкі фронт, правакацыя нямецкага генэрала.

Заняцьця мосту праз Рэгэн беларускім аддзелам у сіле 30 жаўнераў падкамандай лейтэнанта Якімовіча. Асягненьне Цвізэля, разбраяньне. Ноч у Цвізэлі.

Пастаеньне дывізыі у Цвізэлі. Прадстаўнік Амэрыканскага штабу оглядая дывізыю, абвесціў нас ваенна-палоннымі. Пералоз дывізыі у зборны пункт ваенна-палонных у Каме. Ноч у Каме. Развоз ваенна палонных у Каме раздел дывізыі. Падпалкоўнік Рогал Кутылоўск з часткай дывізыі у французы выдае афіцэраў бальшавікам.

vytoki.net

Прапагандовае значэньне беларускай вайсковай акцыі.

1. Не браў удзелу у разстрэлах жыдоў. Заяўленьне начальніка С.Д. мінскага Гойзэра на судзе ваенных прэступнікаў у Кобленцы.
2. Пераход афіцэрскай школы да французскіх партызанаў.
3. Пераход беларускай дывізыі да амэрыканскай арміі пры першай надарыўшайся нагодзе.
4. Вайсковая беларуская акцыя у гісторыі Амэрыканскай вайсковасці.

vytoki.net